Дзе можна атрымаць інфармацыю аб аўкцыёнах па продажы зямлі?

Пытанне: Дзе я магу атрымаць інфармацыю аб аўкцыёнах па продажы зямлі, якія крытэрыі падбору зямельных участкаў, ці можна ініцыяваць правядзенне аўкцыёну?

Адказ: З парадкам правядзення аўкцыёнаў і ўжо сфарміраванымі зямельнымі ўчасткамі Вы можаце азнаёміцца на сайце галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Гомельскага аблвыканкама (http://www.gomeloblzem.by/aukcijny/).
Перайсці на патрэбны раздзел сайта Вы можаце, скарыстаўшыся QR-кодам

Падрабязную інфармацыю па зямельных участках, якія Вас цікавяць, можна атрымаць у аддзеле землеўпарадкавання Лельчыцкага райвыканкама па тэлефонах 50833, 51706.
Нараўне з ужо сфарміраванымі для продажу зямельнымі ўчасткамі зацікаўленая асоба мае магчымасць унесці свае прапановы аб фарміраванні ўчастка на аўкцыён, звярнуўшыся з пісьмовай заявай у мясцовы выканаўчы камітэт па месцы знаходжання зямельнага ўчастка.
Адносна крытэрыяў зямельных участкаў паведамляем, што строгіх крытэрыяў няма, за выключэннем горадабудаўнічых і архітэктурных рэгламентаў. Гэта значыць размяшчэнне зямельнага ўчастка ў канкрэтным месцы павінна адпавядаць і ўзгадняцца з архітэктурнымі і горадабудаўнічымі нормамі.